## *МАСТАЦТВАЗНАЎСТВА, ЭТНАГРАФІЯ, ФАЛЬКЛОР*

*УДК 72(091)(476)*

*Я. В. МАРОЗАЎ*

# БЕЛАРУСКАЯ АРХІТЭКТУРА 1920–1930-х ГАДОЎ: АСНОЎНЫЯ МАСТАЦКІЯ НАПРАМКІ

*Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы НАН Беларусі*

*(Паступіў у рэдакцыю 10.11.2005)*

Асаблівасці архітэктуры Беларусі 1920–1930-х гадоў, так званага міжваеннага перыяду, калі яе ўсходнія і заходнія рэгіёны ўваходзілі ў склад розных дзяржаў, так і не былі даследаваны ў сувязі з адпаведнымі прычынамі. Гэта прывяло да таго, што ў нашы дні многія спецыялісты не звязваюць дадзены перыяд з дасягненнямі ў галіне айчыннай архітэктуры, не праведзена належнай мастацтвазнаўчай інтэрпрэтацыі архітэктурных форм гэтага часу, у тым ліку форм авангарда. Сёння прыйшоў час вывучыць гэтыя збудаванні, пазнаёміцца з шырокім колам з'яў, якія звязаны з архітэктурай, сістэматызаваць матэрыял шляхам выдзялення па стылёвых прыметах груп пабудоў і звязаць іх з агульным развіццём еўрапейскай архітэктуры.

У аснове методыкі такога даследавання ляжыць стылістычны аналіз, аднак паняцце «стыль» у сучасным мастацтвазнаўстве неадназначнае. Па-першае, стыль у адпаведнасці з традыцыяй даследчыкаў фармальнай школы (Г. Вёльфлін) успрымаецца як агульнасць фармальных прымет. Па-другое, стыль услед за прадстаўнікамі сацыялогіі мастацтва звязваюць з сацыяльнымі і палітычнымі фактарамі, шляхам атаясамлівання стылю з творамі, якія ўзніклі ў рамках той або іншай гістарычнай фармацыі (І. Іофэ). Па-трэцяе, распаўсюджаны інтэрпрэтацыйныя плыні, якія працягваюць традыцыю герменеўтычнай школы, дзе адбываецца альбо поўнае адмаўленне ад катэгорыі стылю, альбо рэдуцыраванне гэтага паняцця да агульнасці прынцыпаў праектавання і пераважаючага светаадчування вытворцаў і спажыўцоў архітэктуры.

Беручы пад ўвагу найбольш распаўсюджанае ўспрыманне тэрміна «стыль» як паняцця, якое апісвае структуру вобраза і мастацкую форму [1, с. 514], вызначым яго выкарыстанне ў рамках дадзенага даследавання.

Стыль – паняцце шматузроўневае. Можна гаварыць аб стылі асобнага майстра, аб архітэктурным стылі як аб нейкай лакальнай супольнасці, якая мае адносна невялікія часавыя межы і тэрыторыю распаўсюджвання, аб стылі як аб стылі эпохі і г. д. На ўсіх гэтых узроўнях стыль успрымаецца ў першую чаргу як падобнасць кампазіцыйнага будавання, архітэктурных дэталяў і дэкаратыўных матываў. Пасля гэтага ідзе ацэнка і ў нейкай ступені наша разуменне стылю, якое атрымоўваецца шляхам супастаўлення свайго вопыту с фактамі і падзеямі гісторыі. Гэта і ёсць інтэрпрэтацыя, без якой творы архітэктуры губляюць сэнс і культурную каштоўнасць, пераходзячы проста ва утылітарныя збудаванні.

Агульнасць па фармальнай прымеце заўсёды прысутнічае ў паняцці стыль. Так, напрыклад, нават творы эклектыкі (архітэктуры выбару), эпохі другой паловы XIX – пачатку XX ст., якую прынята лічыць бесстылёвай або шматстылёвай, усё ж адрозніваюцца ў сваіх формах і дэталях ад стылю выкарыстаных гістарычных аналагаў. А пры вывучэнні правінцыяльнай архітэктуры, дзе змена тэндэнцый заўсёды менш радыкальная, фармальная агульнасць пры вызначэнні стылю яшчэ больш відавочная.

У сучаснай літаратуры архітэктура міжваеннага перыяду, невялікага гістарычнага адрэзку даўжынёй у дваццаць год, апісваецца пры дапамозе вялікай колькасці стыляў: мадэрн, эклектыка, экспрэсіянізм, канструктывізм, рацыяналізм, функцыяналізм, ар дэко, новая рэчыўнасць, ампір і г. д. Кожная з гэтых назваў, з аднаго боку, прэтэндуе на апісанне вялікай з'явы, з другога – ужо замацавалася за адпаведнай архітэктурнай школай, творчай групай. Так, напрыклад, «канструктывізм» у савецкай літаратуры разумеўся як міжнародны стыль, у апошні час у даследаваннях С. А. Хан-Магамедава значэнне яго звузілася да назвы творчай плыні ў савецкім авангардзе, звязанай з АСА і часопісам «Сучасная архітэктура» [2, с. 23].

Такім чынам, выкарыстанне тэрміна «стыль» для адносна лакальных з'яў, ужо апісаных у еўрапейскай мастацтвазнаўчай навуцы і вядомых у прафесійнай сферы, для дадзенага даследавання будзе найбольш рацыянальнае. Акрамя таго, часавая дыстанцыя, з пазіцый якой разглядаецца матэрыял, яшчэ вельмі малая, каб сёння, калі прайшло яшчэ менш ста гадоў, ахарактарызаваць міжваенны перыяд у цэлым паняццем «стыль эпохі», калі стыль разумеецца як «рэальнасць дадзенай эпохі, створаная ў роўнай ступені як стылёвым адзінствам, так і стылёвай шматгалосіцай» [3, с. 29]. У той жа час неабходнасць вялікіх абагульненняў для пабудовы агульнай логікі гісторыі архітэктуры міжваеннага перыяду для дадзенага даследавання ўсё-такі відавочна.

У XX ст. даследчыкамі архітэктуры 1920–1930-х гадоў па рознаму разглядаўся матэрыял. Часта выкарыстоўвалася падзяленне па тыпах збудаванняў, як, напрыклад, у даследаванні беларускай савецкай архітэктуры А. А. Воінава [4]. Аднак стылёвыя пытанні архітэктуры пры такім падыходзе не закранаюцца. Значна бліжэй да адлюстравання феномена стылю падыходзіць прынцып вызначэння перыядаў у развіцці архітэктуры. Для міжваеннай беларускай савецкай архітэктуры ўпершыню перыядызацыя была прапанавана М. С. Кацарам [5]. Нягледзячы на тое што вызначаныя аўтарам перыяды былі ў першую чаргу прывязаны да палітычных падзей, пяцігодак, яны таксама адлюстроўвалі і змены ў стылістычнай накіраванасці архітэктуры. Як нетрадыцыйны падыход варта нагадаць працу У. Папернага, які пабудаваў сваё даследаванне на ўмоўным падзяленні савецкай архітэктуры на дзве катэгорыі: «культура адзін» і «культура два», якія апісвалі культуру авангарда і неакласікі ў савецкай архітэктуры [6]. Гэтым У. Паперны абгрунтоўвае іншы падыход, які знаходзіцца на мяжы мастацтвазнаўства і культуралогіі, дзе ў поле зроку трапляюць не толькі ўласна фармальныя асаблівасці архітэктуры, але і больш глыбінныя адрозненні ў мадэлях культуры, што абумоўліваюць гэтыя асаблівасці. Варта прызнаць, што такі метад правамерны для аналізу мастацтва менавіта міжваеннага дваццацігоддзя, часу барацьбы розных ідэалагем, калі кірункі ў мастацтве часам залежалі ад палітычных поглядаў іх стваральнікаў. У той жа час нельга звесці ўсю сутнасць феномена мастацтва толькі да прыналежнасці да тых або іншых палітычных груповак.

Да сённяшняга часу не існуе тэрміна, з дапамогай якога можна адназначна вызначыць сэнсавыя адрозненні ў архітэктуры, перыядызацыя ж мастацтва падразумявае вызначэнне дастаткова выразных часавых межаў для розных з'яў у архітэктуры, якія ў дадзеным выпадку не заўсёды супадаюць для Усходняй і Заходняй Беларусі. Таму ў даследаванні прынята выкарыстоўваць тэрмін «напрамак», сутнасць якога складае сукупнасць фармальных рыс архітэктуры і іх абумоўленасць як часткі культуры.

У мастацтвазнаўстве тэрмін «напрамак» часта інтэрпрэтуецца як некаторая сукупнасць унутры стылю, у тым жа сэнсе выкарыстоўваецца тэрмін «плынь». У дадзеным даследаванні тэрмін «напрамак» набывае іншы сэнс: уключае ў сябе стылі і вызначае вектар развіцця культуры. Такое вызначэнне заснавана на разуменні мастацтва і культуры як з'яў, у значнай ступені не залежных ад палітычных рэалій, якія валодаюць іманентнымі законамі развіцця. Такім чынам, напрамкі варта разумець як стадыі развіцця культуры, якія змяняюць адна адну і выяўляюцца ў розных краінах, часам рознымі стылямі.

Зыходзячы з такога падыходу, можна выявіць тры напрамкі ў беларускай архітэктуры міжваеннага перыяду. Першы напрамак ахоплівае гады пасля заканчэння першай сусветнай і грамадзянскай войнаў, калі ў беларускім дойлідстве, як на ўсходзе, так і на захадзе, атрымалі развіццё прыёмы эклектыкі і мадэрна. У рамках гэтага напрамку была папулярная ідэя нацыянальнага адраджэння, як польскага, так і беларускага, што праявілася ў архітэктуры ў выглядзе розных гістарычных

`стылізацый. Затым у канцы 1920-х гадоў ва Усходняй Беларусі і некалькі пазней, у пачатку 1930-х, у Заходняй Беларусі атрымоўвае распаўсюджванне другі кірунак, заснаваны на авангардных формах рускага канструктывізму і заходняга функцыяналізму. Трэці кірунак фарміруецца ў канцы 1930-х гадоў, калі пачынаюць узмацняцца неакласічныя тэндэнцыі, у пабудовах з'яўляецца манументальнасць і строгасць.

Калі характарызаваць першы напрамак у архітэктуры, храналагічным пачаткам якога будзем лічыць 1921 г. – падпісанне Рыжскага мірнага дагавора, варта адзначыць, што большасць будаўнічых работ было накіравана на аднаўленне разбураных вайной будынкаў, новае будаўніцтва сустракалася даставкова рэдка. Пры рамонце і ўзвядзенні новых будынкаў архітэктары і будаўнікі выкарыстоўвалі прыёмы даваеннай архітэктуры пачатку XX ст. Асноўная маса праекціроўшчыкаў атрымалі адукацыю і сфарміравалі свае эстэтычныя погляды яшчэ да рэвалюцыі, а прафесійныя зносіны праз часопісы, паездкі ў час вайны і смуты былі ўскладнены, што таксама стала прычынай захавання ў архітэктуры ранейшай стылістыкі.

З вядомых прыкладаў на тэрыторыі Усходняй Беларусі можна прывесці праекты дома Цэнтраспірту і лазні па вуліцы Лекерта ў Мінску, зробленыя ў 1926 г. [7]. Абодва будынкі не выдзяляюцца з правінцыяльнай архітэктуры пачатку XX ст. і па стылёвых прыкметах іх можна аднесці да эклектыкі з выкарыстаннем некаторых дэталяў стылю мадэрн. Значна больш выразны вучэбны будынак у Гомелі па вуліцы Кірава, 131. Дом мае сіметрычную кампазіцыю, цэнтральная частка і бакавыя крылы завершаны ступеньчатымі франтонамі з характэрным для мадэрна дэкаратыўным прыёмам – неглыбокай нішай са скругленымі вугламі. Фасады будынка простыя і гарманічныя, кладка не тынкаваная і выканана дастаткова якасна, што сведчыць аб высокай прафесійнай культуры праекціроўшчыкаў і будаўнікоў. У блізкай стылістыцы пабудаваны і дом у Гомелі па вуліцы Леніна, 31. Архітэктарам гэтага будынка быў С. Д. Шабунеўскі, які актыўна працаваў яшчэ да рэвалюцыі.

У пачатку–сярэдзіне 1920-х гадоў на архітэктурную практыку як усходніх, так і заходніх рэгіёнаў Беларусі моцна ўплывалі ідэі адраджэння нацыянальных архітэктурных стыляў. У Савецкай Беларусі гэта быў час нацыянальнага адраджэння. У архітэктуры распаўсюджваліся ідэі аднаўлення самабытнага беларускага стылю, вытокі якога шукалі ў архітэктуры замкаў, палацаў і культавых пабудоў. Спецыяльныя экспедыцыі накіроўваліся на Случчыну, Бабруйшчыну, Мазыршчыну і іншыя акругі для вывучэння і замалёўкі захаваўшыхся помнікаў. М. М. Шчакаціхіным і М. І. Каспяровічам былі напісаны кнігі аб беларускай архітэктуры. Аднак рэалізаваныя прыклады беларускага стылю таго перыяду ва Усходняй Беларусі знайсці не ўдалося, вядома толькі, што «калі ў 1926 г. было даручана архітэктуру Струкаву зрабіць праект для пабудовы Мінскага вакзала, яму было прапанавана вывучыць феадальныя замкі князёў Радзівілаў і Панятоўскага, якія павінны былі стаць «узорам» беларускага стылю» [8, с. 23].

Ідэя нацыянальнага беларускага стылю развівалася ў Вільні архітэктарам Л. Вітанам-Дубейкаўскім, вядомым дзеячам беларускага адраджэння і стваральнікам арыгінальнай сістэмы драўлянага будаўніцтва. Яшчэ ў 1916 г., знаходзячыся ў Петраградзе, Л. Вітан-Дубейкаўскі атрымаў ад ксяндза Будзько заказ на праектаванне ў «беларускім стылі» драўлянага касцёла ў Янатрудзе Полацкага павета. Касцёл меў высокі скатны дах, закончаны невялікай вежкай, блізкай па форме да стылю барока, на заходнім фасадзе мелася «падсень» – элемент, запазычаны з народнай архітэктуры. Яшчэ адзін касцёл, дзе таксама была «падсень», Л. Вітан-Дубейкаўскі пабудаваў у 1924–1926 гг. у Друсвятах. Сцены ашаляваныя дошкамі і пазбаўленыя ўсялякіх упрыгожванняў, разам з высокім скатным дахам стваралі цэласную маналітную форму, закончаную высокай шмат'яруснай вежай, што, па меркаванні Л. Вітан-Дубейкаўскага, нагадвала беларускі стыль [9, с. 41].

Заходнія рэгіёны Беларусі ўваходзілі ў II Рэч Паспалітую, дзяржаву, адроджаную ў 1919 г. на нацыянальнай ідэі. Тут «нацыянальны рамантызм» у 1920-х гадах пераважаў у мастацтве і архітэктуры і быў своеасаблівым дзяржаўным метадам аб'яднання краіны. Можна выдзеліць некалькі стыляў, своеасаблівых варыянтаў пошуку нацыянальных рыс архітэктуры, у якіх за ўзор браліся вобразы розных гістарычных эпох.

Неабарока з элементамі мадэрна выкарыстоўвалася, як правіла, у грамадскіх будынках, пабудаваных за дзяржаўны кошт. Справа ў тым, што ў пачатку XX ст. шматлікія манастыры і касцёлы

ў стылі барока, пабудаваныя на беларускіх землях яшчэ да падзелаў Рэчы Паспалітай, вылучаліся сярод масавай забудовы сваёй прыгажосцю і манументальнасцю. Па меркаванні ідэолагаў «польскасці», яны служылі пакінутымі на гэтых землях узорамі высокай польскай культуры ў процівагу менш выразным тыпізаваным будынкам паштовых станцый, вакзалаў і цэркваў, пабудаваным за час знаходжання заходнебеларускіх зямель у складзе Расійскай імперыі [10, с. 23]. Яркі прыклад неабарока – гэта будынак старасва ў Навагрудку. Двухпавярховы аб'ём завершаны высокім чатырохскатным дахам, цэнтральная частка завершана разным шчытом у некалькі спрошчаных формах барока. Падобны прыём выкарыстаны таксама ў будынках вакзалаў у Слоніме, Ваўкавыску і Беняконях.

Шэраг грамадскіх будынкаў узводзіўся з выкарыстаннем стылю класіцызм. Такім з'яўляецца будынак Польскага банка ў Брэсце, пабудаваны ў 1926 г. па праекце варшаўскага архітэктара С. Філасевіча. Паўкалоны і пілястры на фасадзе тут павінны былі ўвасабляць надзейнасць і вернасць традыцыям. Для афармлення ўваходу ў афіцэрскае казіно ў Брэсце архітэктар Ю. Лісецкі выкарыстаў чатыры калоны іанічнага ордэра, што павінна было стаць знакам высокай культуры, гонару, годнасці і высакароднасці афіцэраў.

У будаўніцтве жылых дамоў распаўсюдзіўся «дварковы» стыль, у якім знаходзілі ўвасабленне ідэі аднаўлення тыповай сядзібы шляхты, так званага «dwórka», характэрным элементам якога лічыўся ламаны «польскі» дах. Формы народнай архітэктуры Прыкарпацця, якія з'яўляліся ў пабудовах на тэрыторыі Заходняй Беларусі, ілюстравалі ідэю ўзнаўлення сапраўды польскага архітэктурнага стылю, які нібыта захаваўся ў першапачатковым выглядзе толькі ў рэгіёне Закапанэ. Цікавым прыкладам «закапаньскага» стылю можа служыць пасёлак для служачых у Браславе, пабудаваны па праекце віленскага архітэктара прафесара Ю. Клоса. У афармленні франтонаў тут выкарыстаны характэрны для «закапаньскага» стылю матыў узыходзячага сонца з промнямі, якія разыходзяцца.

Відавочная ўнутраная сувязь такіх розных з'яў беларускай архітэктуры, як неабарока, неакласіка, «закапаньскі», «дварковы» стылі і іншыя стылёвыя варыянты ў рамках эклектыкі і нацыянальнага мадэрна. Агульнай адметнай рысай гэтага напрамку з'яўляюцца арыентацыя на традыцыю, пошук архітэктурных вобразаў і дэкаратыўных матываў у архітэктуры «залатога веку» альбо ў народным дойлідстве. Нягледзячы на вызначаную навізну гэтага напрамку для беларускай архітэктуры, варта адзначыць, што падобныя формы і ідэі былі распаўсюджаны ў еўрапейскай культуры яшчэ ў самым пачатку XX ст.

Калі разглядаць другі напрамак у архітэктуры 1920–1930-х гадоў, варта звязаць яго з узнікненнем і развіццём так званай «сучаснай архітэктуры» (modern architecture). Гэтую з'яву таксама называюць функцыяналізмам, падкрэсліваючы перавагу функцыянальнага метаду ў праектаванні, або міжнародным стылем, звяртаючы ўвагу на універсальнасць стылістычных прыёмаў, распаўсюджаных у краінах Еўропы і ЗША, у процівагу разнастайнасці эклектычнай архітэктуры. У апошні час у гісторыі мастацтва таксама шырока выкарыстоўваецца тэрмін «мадэрнізм» як апазіцыя «постмадэрнізму», паняццю, якое прыйшло з сучаснай філасофіі. У савецкай архітэктурнай навуцы прымяняўся тэрмін «канструктывізм».

Сёння, безумоўна, складана аб'яднаць у рамках адзінай назвы такія разнастайныя з'явы еўрапейскага архітэктурнага жыцця канца 1920–1930-х гадоў, аднак відавочна, што ўсе яны звязваюцца на ўзроўні эстэтычных ідэй і метаду праектавання. Асноўнае адрозненне – гэта акцэнтаваная арыентацыя на навацыі, прэтэнзія на стварэнне цалкам новай фармальнай мовы архітэктуры. У падмурку гэтага напрамку ляжаць ідэі пераўпарадкавання чалавечага грамадства на аснове мадэрнісцкай дактрыны, якая збліжае гэтую эстэтычную плынь на першым этапе з сацыялістычнымі ідэямі. У той жа час авангард блізкі да пазітывізму, яго эстэтыка шукае трывалы пункт апоры або ў ідэях інжынерыі і эканомікі будаўніцтва, або ў працейшых геаметрычных целах і законах гармоніі.

У 1920-х гадах на тэрыторыі сучаснай Беларусі не было ўласнай архітэктурнай школы, кароткі перыяд існавання Віцебскіх вышэйшых дзяржаўных мастацка-тэхнічных майстэрняў з 1920 па 1921 г., звязаны з імёнамі К. Малевіча і Л. Лісіцкага, у цэлым не меў працягу, а арганізаваны ў 1920 г. Політэхнікум у Мінску толькі пачынаў сваю дзейнасць. Цэнтры развіцця сучаснай архітэктуры ў

той час знаходзіліся за межамі Беларусі, гэта былі Францыя, Германія, Нідэрланды і Расія [2, с. 5]. Такім чынам, варта гаварыць аб успрыманні беларускімі архітэктарамі архітэктурных стыляў і плыняў, якія ідуць з еўрапейскіх краін і Расіі.

У сацыялістычную Усходнюю Беларусь другі напрамак прыйшоў у выглядзе расійскага архітэктурнага авангарда і звязаны з творчасцю расійскіх архітэктараў Г. П. Гольца, А. К. Бурава, Г. Л. Лаўрова, І. Р. Лангбарда, якія тут працавалі і маладых выпускнікоў маскоўскіх і ленінградскіх ВНУ – М. І. Гілярова, А. П. Воінава, І. І. Валодзькі, А. М. Крылова і Н. М. Макляцовай, якія атрымалі накіраванне ў Беларусь.

Прыкладам спрошчанага канструктывізму з'яўляецца комплекс будынкаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта, архітэктурны конкурс на які адбыўся ў 1926 г. Прыняты да рэалізацыі праект архітэктараў І. Запарожца і Г. Л. Лаўрова можна арахактарызаваць як адзін з найбольш простых для тэхнічнага ўвасаблення на фоне іншых праектаў майстроў савецкага авангарда. Першыя праекты комплексаў Акадэміі навук БССР і Політэхнічнага інстытута, створаныя архітэктарам Г. Л. Лаўровым, таксама адрозніваліся сціпласцю і скупасцю мастацкай мовы [11]. Неабходнасць простых інжынерных рашэнняў была асабліва важнай для Беларускай ССР, дзе слаба развітая да рэвалюцыі прамысловая вытворчасць была фактычна поўнасцю разбурана ў 1914–1921 гг. у выніку першай сусветнай вайны і вайны Савецкай Расіі з буржуазнай Польшчай.

Можна прывесці і больш яркія прыклады канструктывізму. Гэта унікальныя грамадскія пабудовы, якія першапачаткова праектаваліся з разлікам на большае фінансаванне, дзе характэрныя для канструктывізму дарагія элементы (жалезабетонны каркас і стужачнае шкленне) знайшлі шырокае выкарыстанне. Так, будынак канторы Дзяржаўнага банка СССР, які быў пабудаваны па праекце вядомых маскоўскіх архітэктараў Г. П. Гольца і М. П. Паруснікава ў 1927–1929 гг., меў практычна напалову зашклёны фасад. У будынку Нацыянальнай бібліятэкі (імя У. І. Леніна) на галоўным фасадзе выкарыстана стужачнае шкленне, паўкруглы аб'ём чытальнай залы стаіць на жалезабетонных пілонах вышынёй на два паверхі. Лічыцца, што архітэктара Г. Л. Лаўрова кансультаваў адзін з лідэраў савецкага канструктывізму А. А. Веснін [4, с. 47].

Другі напрамак стаў пераважаць у архітэктуры Усходняй Беларусі 1920-х – пачатку 1930-х гадоў, у аснове яго ляжалі прынцыпы еўрапейскага і расійскага авангарда: адмова ад архітэктурных упрыгожванняў фасадаў, імкненне да максімальнай інсаляцыі памяшканняў, расчлянёныя, адпаведныя прынцыпу функцыянальнага заніравання планы. Аднак, радавыя пабудовы гэтага напрамку не заўсёды непасрэдна мелі ўсе гэтыя прыметы. Напрыклад, праект Фінансава-эканамічнага тэхнікума дэманструе сіметрычны план, на фасадзе цэнтральная частка выдзелена і завершана ўступчатым шчытом [11]. Гэты праект быў створаны ў 1931 г. архітэктарам С. Гайдукевічам, які пачынаў сваю практыку яшчэ да рэвалюцыі, і, верагодна, гэтыя абставіны тлумачаць традыцыйную кампазіцыю будынка.

Авангардныя плыні, якія сфарміравалі другі напрамак, праніклі і ў архітэктуру II Рэчы Паспалітай, а затым распаўсюдзіліся і ў заходніх рэгіёнах Беларусі. Гэта адбылося ў канцы 1920-х – пачатку 1930-х гадоў, што было пазней, чым ва Усходняй Беларусі. Шырокае распаўсюджанне гэтага напрамку супала з пераадоленнем міжнароднага эканамічнага крызісу, верагодна таму ў грамадскай свядомасці формы новай архітэктуры звязваліся з шыкам і элегантнасцю, з развіццём тэхнікі, якая забяспечвала зручнасць і незвычайны камфорт жыцця. Да будынкаў сталі прымяняцца патрабаванні не толькі з пазіцый функцыянальнага заніравання, але і мастацкай выразнасці, якую архітэктары імкнуліся дасягнуць шляхам камбінавання разнастайных авангардных форм і матываў, а таксама выкарыстаннем дарагіх апрацоўчых матэрыялаў. У гэты час неверагодна ўзраслі патрабаванні да якасці будаўніцтва, шырока выкарыстоўваўся маналітны жалезабетонны каркас, сталі паўсюдна ўкараняцца яшчэ даволі рэдкія ў той час інжынерныя сістэмы: цэнтральнае ацяпленне, водаправод і каналізацыя.

У Польшчы 1930-х гадоў авангард стаў незвычайна папулярны сярод высокіх слаёў грамадства, інтэлігенцыі, таму другі напрамак шырока прадстаўлены менавіта ў гарадской жылой архітэктуры, дзе найбольш распаўсюджаным тыпам былі асабнякі. Цікавы асабняк па вул. Кірпічнай у г. Гродне, пабудаваны ў 1930-х гадах гарадскім землемерам па праекце, які прывезены з Беластоку. Сам дом незвычайны ў канструктыўным плане: узведзены з бруса, а потым пакрыты звонку і знутры

тынкоўкай. Прычым знешняя тынкоўка, зробленая з дадаткам слюды, цудоўна захавалася без змен да сённяшняга дня. Кампазіцыя асабняка будуецца на спалучэнні простых прамавугольных форм, лесвіца падкрэслена вертыкальнай паласой шклення.

Другі напрамак праявіўся ў пабудаваных па праектах прафесійных архітэктараў грамадскіх будынкаў і шматпавярховых жылых дамах, аднак асобныя элементы, характэрныя для гэтага напрамку, можна знайсці і ў аднапавярховых гарадскіх дамах традыцыйнай архітэктуры – гэта шырокія вокны, абкладзеныя белай кафляй, печкі са скругленымі вугламі, скруглены пераход паміж сценамі і столлю.

Падыходзячы да характарыстыкі трэцяга напрамку ў беларускай архітэктуры 1920–1930-х гадоў, варта адзначыць, што ацэнкі яго неадназначныя. Сярод даследчыкаў, у асноўным польскіх, захоўваецца меркаванне аб немагчымасці параўнання спадчыны эпохі «сацыялістычнага рэалізму» з мастацтвам іншых еўрапейскіх краін, якія не зведалі такога моцнага як у СССР ціску з боку дзяржавы. У той жа час шэраг даследчыкаў знаходзяць шмат агульнага ў еўрапейскай архітэктуры перадваеннага дзесяцігоддзя [12, с. 324–327], знаходзячы ў гэтым нейкую адзіную «хвалю неакласіцызму ў Еўропе». Дадзенае даследаванне, як ужо адзначалася раней, адштурхоўваецца ад разумення мастацтва як з'явы, адносна незалежнай ад палітычных і сацыяльных рэалій, што і дазваляе нам разглядаць і супастаўляць фармальныя асаблівасці архітэктуры Усходняй і Заходняй Беларусі.

Трэці напрамак у беларускай архітэктуры вызначаецца з'яўленнем манументальнасці ў будынках, а таксама пераарыентацыяй на ўзоры традыцыйнай, часцей за ўсё класічнай архітэктуры. У СССР пераломным пунктам даследчыкі лічаць конкурс праектаў Палаца Саветаў 1932 г. і яго вынік, які шакіраваў усю сусветную архітэктурную супольнасць. Аднак адыход ад канструктывізму ў савецкай, у тым ліку і беларускай архітэктуры, акрэсліўся значна раней. Праект І. Лангбарда, які ўжо перамог у конкурсе праектаў Дома ўрада БССР 1929 г., адрознівала сумеснае выкарыстанне прыёмаў канструктывізму з класічнымі элементамі. Прыкладам таксама можа з'яўляцца будынак Камунальнага банка (пабудаваны ў 1932 г.), вокны ў якім мелі выцягнутую форму, плоскасць фасада была раздзелена пры дапамозе пілонаў, вылучаўся цокаль, што можна лічыць адметнымі рысамі класічнай архітэктуры. У той жа час плоскі дах цэнтральнай часткі і круглыя вокны ставілі гэтую пабудову ў шэраг мадэрнісцкіх аб'ектаў.

Большасць пабудоў 1930-х гадоў на тэрыторыі Усходняй Беларусі характарызуецца выкарыстаннем прыёмаў класічнай архітэктуры, аднак пры гэтым дэталі (калоны, фрызы) маюць больш спрошчаныя ў параўнанні з класіцызмам формы. Так, напрыклад, у будынках Дома афіцэраў (Дом Чырвонай Арміі) і Прэзідыума Акадэміі навук БССР архітэктарам І. Р. Лангбардам выкарыстаны калоны без баз і капітэляў. Такое ж рашэнне і на фасадзе будынка гасцініцы «Свіслач» («Беларусь»), пабудаванага па праекце А. П. Воінава.

К канцу 1930-х гадоў сацрэалізм – афіцыйная назва савецкага стылю і метаду – набывае ў архітэктуры Савецкай Беларусі адзіныя кананічныя формы. Яркі прыклад – будынак кінатэатра «Радзіма» на 700 месцаў у Магілёве, пабудаваны ў 1939 г. архітэктарам У. М. Вараксіным. Па сваіх формах і дэталях лепкі гэты будынак практычна не адрозніваецца ад пасляваеннай архітэктуры 1944–1954 гг.

Самая прыкметная пабудова ў Заходняй Беларусі, якую па фармальных прыметах можна аднесці да трэцяга напрамку, – гэта будынак былога ваяводства, сёння аблвыканкома, пабудаваны ў 1938 г. на вуліцы Леніна (Люблінскай уніі) у Брэсце. Яго фасады пазбаўлены якога-небудзь дэкору, аднак з класічнай архітэктурай іх збліжае прыём выдзялення цокаля і вертыкальна выцягнутыя, класічнай формы вокны. Уваход у будынак аформлены шэрагам высокіх, на чатыры паверхі, прамавугольных пілонаў, якія не маюць ні баз, ні капітэляў. Гэты элемент, які характэрны для польскай архітэктуры 1930-х гадоў, замяняе традыцыйны класічны порцік. Будынак, нягледзячы на невялікія па сучасных мерках памеры, мае манументальны выгляд, вельмі лаканічны і прапарцыянальны.

У будынку сучаснага цэнтра пазашкольнай работы на вуліцы Савецкай, 41 у Ашмянах, пабудаваным у 1935 г., выкарыстаны не толькі кампазіцыйныя прыёмы, але і архітэктурныя дэталі класіцызму – цэнтральная частка ўпрыгожана пілястрамі стылізаванага іанічнага ордэра. У той жа час формы лесвічных поручняў, балконнага агароджвання і аконных рашотак падкрэслена сучасныя, канструкцыі і аздабленне будынка зроблены на высокім інжынерным узроўні.

Супастаўляючы архітэктурныя пабудовы ўсходніх і заходніх зямель, якія аб'яднаны трэцім напрамкам, можна адзначыць, што вялікае распаўсюджанне гэты напрамак атрымаў у архітэктуры Усходняй Беларусі. Прычынай з'явіліся як дзяржаўнае фінансаванне будаўніцтва і жорсткі наменклатурны кантроль, так і ідэалагічныя ўстаноўкі, што ўздзейнічалі на мастацкі светапогляд. У Заходняй жа Беларусі, наадварот, можна прывесці толькі некалькі прыкладаў пабудоў, якія адносяцца да гэтага напрамку. Тлумачыцца гэта, з аднаго боку, малой колькасцю дзяржаўных заказаў, а менавіта такому тыпу будынкаў у большай ступені адпавядала манументальная архітэктура, з другога – адсутнасць дагматычнай ідэалогіі і распрацаванай для яе архітэктурнай тэорыі, як гэта было зроблена ў канцы 1930-х гадоў у СССР.

## Вывады

1. Прапанаваны падыход, які заснаваны на аналізе фармальных рыс архітэктуры з улікам яе абумоўленасці як часткі культуры, дазволіў выдзеліць тры напрамкі ў беларускай архітэктуры 1920–1930-х гадоў і ахарактарызаваць іх у кантэксце агульнаеўрапейскага мастацтва. Гэта дае магчымасць упершыню вывучыць у рамках аднаго даследавання архітэктурную спадчыну Беларусі, яе ўсходніх і заходніх рэгіёнаў, якія ўваходзілі ў разглядаемы час у склад розных дзяржаў.

2. Праведзены аналіз архітэктурнай спадчыны ўсходніх і заходніх беларускіх земель паказаў, што ў межах адпаведных напрамкаў архітэктурныя формы і змястоўныя аспекты пабудоў былі блізкія і ў пэўнай ступені супадалі.

3. Несупадзенне развіцця напрамкаў у архітэктуры ўсходніх і заходніх рэгіёнаў Беларусі, а таксама тое, у якой колькасці і ў якім архітэктурным тыпе пабудоў яны былі найбольш шырока прадстаўлены, тлумачыцца сацыяльнымі і палітычнымі адрозненнямі гэтых рэгіёнаў у разглядаемы час.

## Літаратура


1. Недошивин Г. А., Черных А. М., Чудакова М. О., Кантор А. М. Стиль // БСЭ. 3-е изд. М.,1976. Т. 24. Кн. 1.

2. Хан-Магомедов С. О. Архитектура советского авангарда: В 2 кн. М.: Стройиздат, 1996–2001. Кн.1: Проблемы формообразования. Мастера и течения. М., 1996.

3. Каплун А. И. Стиль и архитектура. М.: Стройиздат, 1985.

4. Воинов А. А. История архитектуры Белоруссии: Учеб. для вузов по спец. 1201 «Архитектура»: В 2 т. 2-е изд., перераб. и доп. Мн.: Выш. шк.,1987. Т.2 Советский период. 1987.

5. Кацер М. С. Белорусская архитектура: Исторический очерк. Мн.: Гос. издат. БССР, 1956.

6. Паперный В. Культура «Два». М.: Новое литературное обозрение, 1996.

7. Национальный архив Республики Беларусь, ф.31, оп.1, д.124, 144.

8. Костелянский А. Изобразительное искусство БССР. М.-Л.: ОГИЗ-ИЗОГИЗ, 1932.

9. Глінька В. Л. Вітан-Дубейкаўскі: Старонкі біяграфіі // Архитектура и строительство Белоруссии. 1991. № 5. С. 40–45.

10. Rutkowski Sz. Budownictwo na wshodniem pograniczu Polski// Sztuki Pękne. 1925. nr. 46. S. 917–920.

11. Государственный архив Минской области, ф. 351, оп. 2, д. 19, 21, 26, 33.

12. Шульц Б. «Особый случай» или логика развития? Нацистская и сталинская архитектура в историческом контексте// Россия-Германия: культурные связи, искусство, литература в первой половине двадцатого века. М.: ГМИИ им. А. С. Пушкина, 2000.



*Y. V. MAROZAW*


**BELARUSIAN ARCHITECTURE OF 1920s–1930s: MAIN ART SCHOOLS**

## Summary


It is considered the forming of the main art schools in the architecture of Belarus in 1920s-1930s. Three art trends have been allocated on the base of the stylistic peculiarities of buildings. It is conducted the analysis of the most specific objects.